МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

# ЗАГАД

# ПРИКАЗ

09.06.2025 № 98

г. Мінск

г. Минск

Аб правядзенні рэспубліканскага конкурсу на стварэнне ў 2025 годзе твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу Міністэрства культуры

У адпаведнасці з артыкулам 17 і падпунктам 4.1 пункта 4 артыкула 210 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, на падставе падпунктаў 5.8 і 5.9 пункта 5 і падпункта 8.12 пункта 8 Палажэння аб Міністэрстве культуры, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 студзеня 2017 г. № 40
ЗАГАДВАЮ:

1. Правесці з 12 чэрвеня па 15 снежня 2025 г. рэспубліканскі конкурс на стварэнне ў 2025 годзе твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу Міністэрства культуры.

2. Зацвердзіць Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення рэспубліканскага конкурсу на стварэнне ў 2025 годзе твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу Міністэрства культуры (дадаецца).

3. Кантроль за выкананнем загаду ўскласці на першага намесніка Міністра культуры Шляхціна Д.Г.

Міністр Р.І.Чарнецкі

Зак. 736.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
08.06.2025 № 98

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення рэспубліканскага конкурсу на стварэнне ў 2025 годзе твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу Міністэрства культуры

1. Дадзеная Інструкцыя распрацавана ў адпаведнасці з артыкулам 17 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, артыкулаў 927-930 Грамадзянскага Кодекса Рэспублікі Беларусь і ўстанаўлівае агульны парадак арганізацыі і правядзення рэспубліканскага конкурсу на стварэнне ў 2025 годзе твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу Міністэрства культуры (далей – конкурс).

2. Конкурс праводзіцца ў мэтах:

адраджэння, развіцця, папулярызацыі лепшых традыцый і дасягненняў нацыянальнага выяўленчага мастацтва;

аздаблення творамі выяўленчага мастацтва інтэр'ераў грамадскіх будынкаў.

3. Арганізатарамі конкурсу з'яўляюцца Міністэрства культуры, абласныя і Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты, дзяржаўная ўстанова культуры змешанага тыпу «Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь» (далей – НЦСМ).

Канкрэтныя тэрміны правядзення конкурсу вызначаюцца Міністэрствам культуры.

4. Інфармацыя аб правядзенні конкурсу размяшчаецца ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт на афіцыйным сайце Міністэрства культуры і павінна змяшчаць звесткі аб тэрмінах, умовах і парадку правядзення конкурсу, а таксама іншыя неабходныя звесткі.

5. У конкурсе могуць прымаць удзел прафесійныя мастакі, іншыя творчыя работнікі ў галіне выяўленчага мастацтва, якія маюць прафесійны сертыфікат творчага работніка, а таксама студэнты ўстаноў вышэйшай адукацыі ў галіне выяўленчага мастацтва (далей – удзельнікі конкурсу).

6. Конкурс праводзіцца ў мэтах стварэння 21 твора выяўленчага мастацтва, прысвечанага 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, для аздаблення інтэр'ераў памяшканняў устаноў дадатковай адукацыі

дзяцей і моладзі ў сферы культуры ў абласцях і г. Мінску (па тры ўстановы ў кожнай вобласці і г. Мінску).

На 2025 год у пералік устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры таксама ўключаюцца дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў імя Р.Р.Шырмы г. Пружаны» (Пружанскі раён Брэсцкай вобласці), дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры «Бабініцкая дзіцячая школа мастацтваў» Віцебскага раёна» (Віцебскі раён), дзяржаўная ўстанова адукацыі «Ушацкая дзіцячая школа мастацтваў» (Ушацкі раён Віцебскай вобласці) і дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў № 1 імя Я.К.Цікоцкага» (г. Бабруйск Магілёўскай вобласці), так як створаныя ў 2024 годзе творы выяўленчага мастацтва для дадзеных устаноў па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу не рэкамендаваны Рэспубліканскай экспертнай камісіяй па творах выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (далей – камісія) да набыцця Міністэрствам культуры за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

Пералік устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры, памераў, зместу ствараемых твораў выяўленчага мастацтва у 2025 годзе дадаецца (Дадатак 1 да Інструкцыі).

7. Конкурс праводзіцца ў два этапы:

першы этап з'яўляецца адборачным;

на другім этапе ствараюцца творы выяўленчага мастацтва і падводзяцца вынікі конкурсу.

8. На першым этапе ў перыяд з 12 чэрвеня па 25 жніўня 2025 г. удзельнікі конкурсу накіроўваюць у НЦСМ па адрасе: 220040, г. Мінск, вул. Някрасава, 3:

заяўку на ўдзел у конкурсе па ўстаноўленай форме згодна з дадатакам 2 да дадзенай Інструкцыі);

эскіз твора выяўленчага мастацтва. Эскіз павінен быць выкананы ў матэрыяле, без ужывання кампутарнай графікі.

9. Матэрыялы, якія прадстаўлены з парушэннем патрабаванняў, устаноўленых пунктам 8 дадзенай Інструкцыі, да разгляду не прымаюцца.

10. Выдаткі па стварэнні эскізаў аплачваюць ўдзельнікі конкурсу.

Структурные падраздзяленні мясцовага выканаўчага і распарадчага органа абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню, што ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры, аказваюць садзейнічанне ўдзельнікам конкурсу ў азнаямленні з краявідамі, будынкамі, дакументамі па гісторыі рэгіёна, неабходнымі для стварэння эскіза твора выяўленчага мастацтва.

11. Адбор эскізаў для далейшага стварэння твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу ў перыяд

з 26 жніўня па 8 верасня 2025 г. ажыццяўляе камісія, склад якой зацвярджаецца загадам Міністэрства культуры.

12. На пасяджэнне камісіі могуць запрашацца прадстаўнікі абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры.

13. Крытэрыямі адбору эскізаў з'яўляюцца:

адпаведнасць твора выяўленчага мастацтва прапанаванай тэматыцы, памеру і зместу;

высокі мастацкі ўзровень выканання.

14. Рашэнне аб адборы эскізаў прымаецца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў членаў камісіі. Рашэнне лічыцца правамоцным, калі на пасяджэнні прысутнічала не менш за дзве трэці агульнага складу камісіі. Пры роўнасці галасоў прымаецца рашэнне, за якое прагаласаваў старшыня.

Рашэнне камісіі афармляецца пратаколам, які падпісвае старшыня і сакратар на працягу пяці дзён пасля дня правядзення пасяджэння.

15. Спіс эскізаў, адабраных для стварэння твораў выяўленчага мастацтва, публікуецца ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт на афіцыйным сайце Міністэрства культуры не пазней за пяць дзён пасля афармлення пратакола пасяджэння камісіі.

16. У перыяд з 9 верасня па 9 лістапада 2025 г. удзельнікі другога этапу конкурсу ствараюць творы выяўленчага мастацтва ў адпаведнасці з эскізамі.

Выдаткі па стварэнні твораў выяўленчага мастацтва аплачваюць удзельнікі другога этапу конкурсу.

Структурныя падраздзяленні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры, аказваюць садзейнічанне удзельнікам другога этапу конкурсу ў азнаямленні з краявідамі, будынкамі, дакументамі па гісторыі рэгіёна, неабходнымі для стварэння твора выяўленчага мастацтва.

17. У перыяд з 10 па 14 лістапада 2025 г. удзельнікі другога этапу конкурсу прадстаўляюць творы выяўленчага мастацтва ў НЦСМ. Палатно на падрамніку павінна быць апрацавана кантам.

18. У перыяд з 15 лістапада па 15 снежня 2025 г. камісія разглядае творы выяўленчага мастацтва і прымае рашэнне рэкамендаваць (або не рэкамендаваць) іх да набыцця Міністэрствам культуры за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

19. Творы выяўленчага мастацтва, выкананыя з дабаўленнем элементаў камп'ютарнай графікі або прынта, не разглядаюцца камісіяй і не рэкамендуюцца да набыцця Міністэрствам культуры за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

20. Рашэнне прымаецца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў членаў камісіі. Рашэнне лічыцца правамоцным, калі на пасяджэнні прысутнічала не менш за дзве трэці агульнага складу камісіі. Пры роўнасці галасоў прымаецца рашэнне, за якое прагаласаваў старшыня.

Рашэнне камісіі афармляецца пратаколам, які падпісвае старшыня і сакратар на працягу пяці дзён пасля дня правядзення пасяджэння.

21. Творы выяўленчага мастацтва набываюцца Міністэрствам культуры за кошт сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце Міністэрству культуры на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў, і перадаюцца ўстановам дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры для аздаблення інтэр'ераў памяшканняў.

Дадатак 1
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення рэспубліканскага конкурсу на стварэнне ў 2025 годзе твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу Міністэрства культуры

ПЕРАЛІК
установ дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры, памераў, зместу ствараемых твораў выяўленчага мастацтва ў 2025 годзе

| Адміністра-цыйна-тэрытарыяль-ная адзінка | Установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры | Памер твора выяўленчага мастацтва | Змест твора выяўленчага мастацтва |
|---|---|---|---|
| **Брэсцкая вобласць** | | | |
| Камянецкі раён | Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Камянецкая дзіцячая школа мастацтваў» | 59,4х84,1 см (фармат А1) | Канцэртная брыгада выступае перад салдатамі |
| Пінскі раён | Установа адукацыі «Парахонская дзяржаўная дзіцячая школа мастацтваў» | 59,4х84,1 см (фармат А1) | Салдат, які прыйшоў з вайны, грае на музычным інструменце |
| Бярозаўскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Белаазёрская дзіцячая школа мастацтваў» | 42х59,4 см (фармат А2) | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – квітнеючы Пераможны май |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Пружанскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў імя Р.Р.Шырмы г. Пружаны» | 42х59,4 см (фармат А2) | Карціна жыццесцвярджальнага характару: салдат (бацька, муж, сын) вярнуўся з вайны, сустракаецца са сваякамі. Вясна, вясковы пейзаж, яблыні ў квецені |
| **Віцебская вобласць** | | | |
| Міёрскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Міёрская дзіцячая школа мастацтваў» | 100х150 см | Памятны знак у гонар воінаў і партызан, якія вызвалілі Міёры ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў |
| Чашнікскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Чашнікская дзіцячая школа мастацтваў» | 80х120 см | Белая Царква (аб'ект ГКК) |
| Пастаўскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Пастаўская дзіцячая школа мастацтваў імя Антонія Тызенгауза» | 100х150 см | Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан у горадзе Паставы |
| Віцебскі раён | Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры «Бабініцкая дзіцячая школа мастацтваў» Віцебскага раёна | 100х100 см | Міхаіл Савіцкі «Віцебскія вароты» (1967) |
| Ушацкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Ушацкая дзіцячая школа мастацтваў» | 100х100 см | «Прарыў. У нашай памяці навечна» (50-годдзю мемарыяльнага комплексу «Прарыў» прысвячаецца) |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Гомельская вобласць** | | | |
| Мазырскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Мазырская дзіцячая школа мастацтваў №1» | 70х100 см | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – «Пра што гуляў салдат…» |
| г.Гомель (Навабеліцкі раён) | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў № 6 г.Гомеля» | 100х150 см | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – вызваленне горада Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў |
| Жыткавіцкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Жыткавіцкая дзіцячая школа мастацтваў імя В.І.Будніка» | 80х70 см | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – «Салют» |
| **Гродзенская вобласць** | | | |
| Мастоўскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Мастоўская дзіцячая школа мастацтваў» | 100х80 см | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – 80-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне |
| Ваўкавыскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Ваўкавыская дзіцячая школа мастацтваў» | 100х80 см | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – 80-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне |
| Воранаўскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Воранаўская дзіцячая школа мастацтваў» | 100х80 см | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – 80-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне |
| **Магілёўская вобласць** | | | |
| Крычаўскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г.Крычава» | 100х200 см | Вызваленне г.Крычава ад нямецка-фашыстскіх захопнікаў 30 верасня 1943 г. 29 верасня 1943 года 369-я Карачаўская |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | стралковая дывізія Бранскага фронту атрымала задачу фарсіраваць раку Сож, зламаўшы супраціўленне праціўніка, вызваліць г.Крычаў. Усю ноч з 29 на 30 верасня ішлі вулічныя баі. Насельніцтва Крычаўшчыны з радасцю сустракала воінаў-вызваліцеляў |
| Клічаўскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г.Клічава» | 175x100 см | Выява мемарыяльнага комплексу партызанскай славы «Усакіна». Мемарыял аб'ядноўвае 4 помнікі. Пачынаецца комплекс мемарыяльным знакам у гонар Магілёўскага падпольнага абласнога камітэта кампартыі. Недалёка размешчаны могілкі мемарыяла, на якіх знаходзіцца 18 брацкіх магіл. Над брацкімі магіламі ўзвышаецца фігура савецкага салдата, адлітая з бронзы |
| Слаўгарадскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г. Слаўгарада» | 100x80 см | Вызваленне Слаўгарадскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у лістападзе 1943 года. Слаўгарадская зямля была вызвалена ад фашыстаў у ходзе Гомельска-Рэчыцкай наступальнай аперацыі злучэннямі 3-й і 50-й армій. Каля 12 тысяч салдат і афіцэраў загінулі ў баях за вызваленне Прапойскага раёна. У 2025 годзе г.Слаўгарад узнагароджаны вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны» |

| | | | |
|---|---|---|---|
| г. Бабруйск | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў № 1 імя Я.К.Цікоцкага» | 200х300 см або дыпціх ці трыпціх | Твор выяўленчага мастацтва можа быць выкананы алеем у сучасным стылі і адлюстроўваць напрамкі дзейнасці дзіцячай школы мастацтваў. Музычныя вобразы могуць быць умоўныя, у якасці фона магчыма выява гістарычнага Бабруйска, дапускаецца выкарыстанне дэкаратыўных элементаў |
| **Мінская вобласць** | | | |
| Дзяржынскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзяржынская дзіцячая школа мастацтваў» | 120х80 см | Выява мірнага часу са спасылкай на тэму – 80-я гадавіна вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка – фашысцкіх захопнікаў (ветэран з дзіцем, на заднім плане можа быць намаляваны ваенны час); выкарыстоўваць слоган «Дзякуй за мір» |
| Нясвіжскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Гарадзейская дзіцячая школа мастацтваў» | 70х100 см | Перамога ў асобах: партрэт Героя Савецкага Саюза М.П. Лешчанкі. 3 ліпеня 1944 года пры вызваленні Нясвіжа ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў артвзвод, якім камандаваў М.П. Лешчанка, падбіў пяць танкаў і на працягу сутак утрымліваў мяжу, не даўшы гітлераўцам прарвацца ў сцяг савецкіх войскаў. За гэты подзвіг М.Лешчанку прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Ён з'яўляецца ганаровым грамадзянінам Нясвіжа, яго імем названа вуліца ў г.Нясвіж |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Капыльскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Капыльская дзіцячая школа мастацтваў» | 90х140 см | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – роля музыкі падчас вайны. Пажадана выява музычных інструментаў у руках выканаўцаў |
| | | **г. Мінск** | |
| г.Мінск (Завадскі раён) | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая музычная школа мастацтваў № 2 імя М.І.Аладава г.Мінска» | 170 х 100 см | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – Музыка на вайне |
| г.Мінск (Кастрычніц-кі раён) | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая музычная школа мастацтваў № 7 г.Мінска» | 150х150 см | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – Салют Перамогі |
| г. Мінск (Цэнтральны раён) | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая музычная школа мастацтваў № 10 імя Я.А.Глебава г.Мінска» | 100х100 см | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – Вялікая памяць Вялікай краіны |

Дадатак 2
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення рэспубліканскага конкурсу на стварэнне ў 2025 годзе твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу Міністэрства культуры

Форма

Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь

______________________________________

______________________________________
(прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (пры наяўнасці) аўтара

______________________________________
эскіза твора выяўленчага мастацтва, кантактны тэлефон)

## ЗАЯЎКА
## НА ЎДЗЕЛ У КОНКУРСЕ НА СТВАРЭННЕ Ў 2025 ГОДЗЕ ТВОРАЎ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА ПА ДЗЯРЖАЎНАМУ САЦЫЯЛЬНА-ТВОРЧАМУ ЗАКАЗУ МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ

Прашу ўключыць мяне ў спіс удзельнікаў рэспубліканскага конкурсу на стварэнне ў 2025 годзе твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу Міністэрства культуры.

Эскіз адпавядае зместу твора для ______________________________
(указваецца установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі

______________________________________________________________
ў сферы культуры, у адпаведнасці з пералікам устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры,

______________________________________________________________
памераў, зместу ствараемых твораў выяўленчага мастацтва ў 2025 годзе)

Паведамляю, што з'яўляюся аўтарам эскіза, які прадстаўлены мной для разгляду на конкурсе.

З умовамі конкурсу азнаёмлены і згодны.

________________ ________________ ________________
(ініцыялы, прозвішча) (подпіс) ( дата)